**Тэма 10.1 Міжнародныя адносіны (1945-1960-я гг.)**

1. Змена суадносін сіл пасля вайны. Парыжская мірная канферэнцыя 1946 г. і яе рашэнні.
2. "Халодная вайна" ў міжнародных адносінах, яе прычыны і сутнасць.
3. Фарміраванне і развіццё двухполюснай сістэмы свету, яе сутнасць.
4. Палітыка ваеннаблокавага супрацьстаяння.

**Літаратура**

Лазько, Р. Р. Навейшая гісторыя краін Еўропы і Амерыкі 1945-1999 гг. Вуч. дап. / Р. Р. Лазько– Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2000. – 120 с. (ГДУ)

Пономарев, М.В. История стран Европы и Америки в Новейшее время /М.В. Пономарев. – М.: Проспект, 2010. – 416 с. (Электр.)

Пленков, О. Ю. Новейшая история стран Европы и Америки / О. Ю. Пленков. – М.: Юрайт, 2016. – 398 с. (ГДУ)

Кузьмина, О. В. История новейшего времени / О. В. Кузьмина, Ю. Н. Ушаков. – М.: Издательский центр «Академия», 2013. – 400 с. (ГДУ)

Гісторыя навейшага часу : вучэб.-метад. дапам. У 2 ч. Ч. 2. 1945–2015 гг. / П. А. Шупляк [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2016. – 247 с. (Электр.)

Новейшая история стран Европы и Америки. XX век. В 3. ч. / Под ред. А. М. Родригеса и М.В.Пономарева. – М.: Гуманитар. Изд. Центр «Владос», 2001. – Ч. 2, 3. – 336 с. (Электр).

История новейшего времени стран Европы и Америки. 1945–2000 гг. / Под ред.Л. С. Белоусова, Е. Ф. Язькова и др. – М.: Простор, 2003. – 480 с. (Электр).

**1.** Другая сусветная вайна прывяла да істотных змен у расстаноўцы сіл на міжнароднай арэне. Германія, Італія і Японія пацярпелі паражнне і на пэўны час пераўтварыліся ў залежныя краіны, якія был падвергнутыя акупацыі. Сярод вылікіх дзяржаў – пераможцаў найбольш аслабленнай з вайны выйшла Францыя, якая фактычна страціла статус вялікай дзяржавы. Вялікабрытанія завяршыла вайну ў ліку трох вялікіх дзяржаў, але яе ваенны і эканамічны патэнцыял значна саступаў ЗША і СССР. Ужо на завяршальным этапе Другой сусвтенай вайны стала відавочнай безумоўная перавага ў свеце дзвюх звышдзяржаў – Савецкага Саюза і Злучаных Штатаў Амерыкі. ЗША выйшлі з вайны значна ўмацаваўшы сваё сусветнае эканамічнае лідарства. Яны мелі моцныя ўзброеныя сілы, валодалі манаполіяй на атамную зброю. СССР эканамічна ўступаў ЗША, але ён валодаў самай шматлікай сухапутнай арміяй. Савецкія ўзброеныя сілы кантралявалі Цэнтральную і Паўднёва-Усходнюю Еўропу, частку Ірана, Карэі, Маньчжурыю. Абедзве звышдзяржавы імкнуліся усталяваць свае інтарэсы ў сусветным маштабе.

У адпаведнасці з рашэннямі Патсдамскай канферэнцыі Савет міністраў замежнызх спраў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі пачаў працу над падрыхтоўкай мірных дагавароў з былымі саюзнікамі Германіі. Адразу выявілася наяўнасць вострых разыходжанняў паміж краінамі Антыгітлераўскай кааліцыі адносна

зместу будучых мірных дагавораў. СССР імкнуўся дабіцца больш лёгкіх умоў для Румыніі, Балгарыі, Венгрыі, дзе ва ўладзе знаходзіліся прасавецкія рэжымы. Заходнія дзяржавы прытрымліваліся аналагічнага падыходу ў адносінах да Італіі. Для СССР пры распрацоўцы мірных дагавораў галоўным было стварыць для сябе пояс бяспекі ва Усходняй Еўропе. Заходнія краіны імкнуліся не дапусціць пераўтварэння Усходняй Еўропы ў сферу ўплыву СССР. Вострыя разыходжанні ўзніклі пры абмеркаванні тэрытарыяльных пытанняў. Заходнія дзяржавы падтрымалі тэрытарыяльныя прытэнзіі Грэцыі да Балгарыі, імкнуліся не дапусціць пераходу Трыесту да Югаславіі. СССР падтрымліваў пазіцыю сваіх саюзнікаў па тэрытарыяльнаму пытанню. Ён выказаўся за прадзел італьянскіх калоній, каб мець плацдарм на паўднёвым узбярэжжы Міжземнага мора.

Мірная канферэнцыя, на якой павінны былі канчаткова ўзгадняцца мірныя дагаворы з саюзнікамі Германіі, праходзіла ў Парыжы з 23 ліпеня па 15 кастрычнік 1946 г. Яна праходзіла ў вострых дыскусіях і не змагла выпрацаваць канчатковыя тэксты мірных дагавораў. Яны былі ўзгоднены на 3-й сесіі Савета міністраў замежных спраў у Нью-Йорку, якая праходзіла з 4 лістапада па 11 снежня 1946 г. Захад разлічваў, што пасля падпісання мірных дагавароў адбудзецца вывад савецкіх войск з краін Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы. Гэта дасць магчымасць правесці там свабодныя выбары.

Мірныя дагаворы краін Антыгітлераўскай кааліцыі з Румыніяй, Балгарыяй, Венгрыяй, Фінляндыяй і Італіяй былі падпісаны ў Парыжы 10 лютага 1947 г. і ўступілі ў сілу 15 верасня 1947 г. Дагаворы замацавалі шэраг тэрытарыяльных змен у Еўропе. Італія саступала невялікія тэрыторыі Францыі і Югаславіі. Трыест станавіўся свабоднай зонай пад кантролем ААН. За СССР заставаліся Бесарабія і тэрыторыі Фінляндыі, якія былі да яго далучаны ў выніку “Зімовай вайны” 1939–1940 гг. Італія прызнавала суверэнітэт Албаніі і Эфіопіі і пазбаўлялася сваіх калоній – Лівіі, Эрытрэі, Італьянскага Самалі. Румыніі была вернута Трансільванія. Дагаворы абмяжоўвалі колькасны склад узброеных сіл для краін, якія прайгралі вайну. Яны павінны былі плаціць рэпарацыі Савецкаму Саюзу, Югаславіі, Грэцыі, Эфіопіі, Албаніі, Чэахаславакіі. Дагаворы абавязвалі Венгрыю, Балгарыю, Румынію, Італію, Фінляндыю забяспечыць сваім грамадзянам асноўныя дэмакратычныя правы.

У адпаведнасці з дагаворамі СССР фактычна замацаваў сваё пануючае становішча ў краінах ЦПУЕ. Ён не даў магчымасці заходнім дзяржавам паўплываць на ўнутрыпалітычныя працэсы ў Балгарыі, Румыніі, Венгрыі і не дапусціў эканамічнага пранікнення ў іх ЗША. Цяпер СССР меў практычна поўную свабоду дзеянняў у ЦПУЕ. Краіны Захаду са свайго боку не дапусцілі колькі-небудзь значнага ўплыву СССР на падзеі ў Італіі і не пусцілі яго ў італьянскія калоніі. Фактычна мірныя дагаворы сталі яшчэ адным крокам да падзелу Еўропы.

Перад саюзнікамі па Антыгітлераўскай кааліцыі стаяла задача падрыхтоўкі і падпісання мірнага дагавора і з Германіяй. Урэгуляванне германскага пытання планавалася на аснове рашэнняў Ялцінскай і

Патсдамскай канферэнцый. Аднак рэалізацыя гэтых рашэнняў у савецкай і заходніх зонах акупацыі адбывалася па-рознаму. Ва ўмовах нарастання супярэчнасцей паміж нядаўнімі саюзнікамі стала немагчыма правядзенне ўзгодненай палітыкі ў адносінах да Германіі.

У такіх умовах вельмі складанна было вырашыць задачу па заключэнню мірнага дагавора з Германіяй. Абмеркаванне гэтай праблемы кіраўніцтвам СССР, ЗША і Вялікабрытаніі пачалося з 4-й сесіі Савета міністраў замежных спраў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі, якая праходзіла ў Маскве ў сакавіку – красавіку 1947 г. Прадстаўнікі заходніх дзяржаў заявілі, што ў іх зонах акупацыі рашэнні Патсдамскай канферэнцыі ўжо выкананы. ЗША прапанавалі падпісаць дагавор з Германіяй аб яе дэмілітарызацыі на 25 гадоў. Пасля яго падпісання меркаваўся вывад акупацыйных войск. СССР пагаджаўся падпісаць дагавор, але настойваў, каб папярэдне ў заходніх зонах былі праведзены нацыяналізацыя, аграрная рэформа, дэмакратызацыя па ўзору савецкай зоны акупацыі, і каб савецкі ўрад быў дапушчаны да кантролю над Рурам. СССР пагаджаўся на вывад акупацыйных войск толькі пасля выплаты Германіяй рэпарацый. ЗША і Вялікабрытанія адверглі савецкія патрабаванні.

Для працягу абмеркавання германскага пытання ў Лондане 25 лістапад – 15 снежня 1947 г. была склікана 5-я сесія Савета міністраў замежных спраў. На той момант ужо былі абнародаваны “дактрына Трумэна” і “план Маршала”. Раскол Еўропы фактычна завяршыўся, і шансы на заключэнне мірнага дагавора з Германіяй яшчэ больш зменшыліся.

Пасля зрыву 5-я сесіі Савета міністраў замежных спраў заходнія дзяржавы ў першай палове 1948 г. правялі ў Лондане дзве нарады з удзелам ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Бельгіі, Нідэрландаў і Люксембурга. На іх было прынята рашэнне аб правядзенні фінансавай рэформы ў заходніх зонах акупацыі і аб усталяванні міжнароднага кантроля над Рурам без удзелу СССР. Спынялася праца Саюзнага кантрольнага савета і пачыналася падрыхтоўка канстытуцыі заходнегерманскай дзяржавы. У адказ СССР склікаў у Варшаве нараду 7 сваіх саюзнікаў, на якой прынятыя ў Лондане рашэнні былі названы незаконнымі. Такім чынам, у перашй палове 1948 г. заходнія дзяржавы са свайго боку, а СССР – са свайго, перайшлі да сепаратных дзеянняў па германскаму пытанню.

Апошняя 6-я сесія Савета міністраў замежных спраў адбылася ў Парыжы 23 мая – 20 чэрвеня 1949 г. На той момант “халодная вайна” была ўжо ў разгары, свет раскалоўся на два лагеры, быў утвараны блок НАТО. Адбыўся першы Берлінскі крызіс 1948–1949 гг., ва ўмовах якога загаварылі пра магчымую вайну паміж удзельнікамі Антыгітлераўскай кааліцыі. Шансаў на тое, што ў умовах раскола свету на два лагеры Германія зможа заставацца нейтральнай не было. А яе далучэнне да аднаго з лагераў карэнным чынам мяняла суадносіны сіл. Таму раскол Германіі стаў выйсцем, якое задаволіла ў той момант і СССР, і Захад. Гэта рабіла практычна невырашальнай у бліжэйшай перспектыве задачу заключэння з Германіяй мірнага дагавора.

Германскае пытанне пасля Другой сусветнай вайны стала адным з найбольш важных у міжнародных адносінах. Яно мела ўнутраны і міжнародны аспекты. Унутраны аспект заключаўся ў расколе краіны. Але ён быў непарыўна звязаны з міжнародным аспектам, без вырашэння якога аб'яднанне было немагчыма. Сутнасць міжнароднага аспекта заключалася ў тым, што не былі вырашаны пытанні міжнародна-прававога становішча Германіі, якія вынікалі з яе паражэння ў Другой сусветнай вайне. Ключавой была праблема заключэння мірнага дагавора з Германіяй.

**2.** У 1945–1947 гг. адбываецца поўны адыход СССР і ЗША і Вялікабрытаніі ад прынцыпаў супрацоўніцтва, якія склаліся ў рамках антыгітлераўскай кааліцыі. Важнае месца ў фарміраванні вобразу СССР як ворага ў амерыканскай палітыцы належала "доўгай тэлеграме" Джорджа Кенана, у той час пасла ў Маскве, ад 22 лютага 1946 г. Кенан лічыўся ў Вашынгтоне галоўным экспертам па СССР. У "доўгай тэлеграме" сцвярджалася, што савецкая палітыка зарыентавана на экспансію, на захоп усё новых сфер уплыву. Гэтую знешнепалітычную спадчыну СССР, на думку Кенана, успрыняў ад царскай Расіі. Дасягненне пагаднення з СССР аб супрацоўніцтве Кенан лічыў немагчымым і настойваў на супрацьдзеянні савецкаму экспансіянізму. Пры гэтым Кенан папярэджваў амерыканскі ўрад, каб той, супрацьдзейнічаючы савецкаму экспансіянізму, сам не перайшоў да экспансіянісцкай палітыкі. Прэзідэнт Трумэн стварыў камітэт на чале са сваім памочнікам Кларкам Кліфандам, які, вывучыўшы "доўгую тэлеграму" падтрымаў яе палажэнні аб неабходнасці супрацьстаяць савецкай экспансіі, у тым ліку з выкарыстаннем атамнай зброі.

Першым публічным выражэннем палітыкі краін Захаду на супрацьстаянне з СССР стала прамова "Мускулы міру", з якой У. Чэрчыль выступіў у Фултане (ЗША) 5 сакавіка 1946 г. Ён заклікаў да аб'яднання сіл усіх дэмакратычных народаў пад эгідай ААН для абароны сваёй свабоды. Чэрчыль заклікаў да стварэння саюза англа-саксонскіх народаў, каб супрацьдзейнічаць распаўсюджванню камунізму. Ён адзначыў, што Еўропу падзяліў "жалезны занавес", які апускаецца ад Шчэціна да Трыеста.

У выступленні ў кангрэсе 12 сакавіка 1947 г. прэзідэнт Трумэн заявіў аб наяўнасці ў свеце не двух блокаў, а двух альтэрнатыўных шляхоў развіцця: дэмакратычнага і таталітарнага. Таталітарныя рэжымы падрываюць асновы сусветнага парадку і пагражаюць ЗША. Прэзідэнт заявіў, што ЗША павінны ўзначаліць крыжовы паход супраць пагрозы камунізму. Гэта было абвяшчэнне "дактрыны Трумана" па стрымліванню камунізму.

Савецкая знешняя палітыка пасля перамогі ў Другой сусветнай вайне вызначалася актыўнымі крокамі па пашырэнні сферы ўплыву СССР. 7 жніўня 1945 г. Савецкі Саюз запатрабаваў ад Турцыі адмовіцца ад канвенцыі Мантрё, па якой Турцыя мела права кантролю за ваеннымі караблямі чарнаморскіх краін, якія праходзілі праз Басфор і Дарданелы. СССР таксама патрабаваў ад Турцыі прадаставіць яму ваенныя базы ў зоне праліваў, перадаць вобласці Карса, Артвіна, Ардагана. Прыняцце савецкага

патрабавання паставіла б Турцыю пад кантроль СССР. Масква не выконвала пагадненне аб вывадзе войск з Ірана, хоць англійскія і амерыканскія войскі яго пакінулі. СССР стаў дабівацца аўтаноміі для Іранскага Азербайджана, які быў акупіраваны савецкімі войскамі, выключнага права на распрацоўку тут нафтавых радовішч. Толькі ў маі 1946 г., пасля таго як пытанне было разгледжана ў Савеце Бяспекі ААН, савецкія войскі пакінулі Іран. СССР і Вялікабрытанія і ЗША адразу пасля завяршэння вайны сутыкнуліся ў Грэцыі. Краіны савецкага блока падтрымалі мясцовых камуністаў, якія распачалі грамадзянскую вайну. У выніку Турцыя і Грэцыя аказаліся краінамі, якія ў рамках “дактрыны Трумэна” першымі атрымалі амерыканскую дапамогу, каб супрацьстаяць камунізму. У ўмовах нарастання супрацьстаяння з Захадам І. Сталін 9 лютага 1946 г. у выступленні перад Вярхоўным Саветам нагадаў ленінскае палажэнне аб непазбежнасці вайны з капіталістычнамі дзяржавамі.

Важным крокам на шляху раскола Еўропы стала прыняцце “плана Маршала”, які быў агучаны 5 жніўня 1947 г. У Маскве было прынята рашэнне адмовіцца ад удзелу ў плане. Пад савецкім ціскам краіны ЦПУЕ таксама адмовіліся прыняць “план Маршала”, хоць першапачаткова Польшча і Чэхаславакія збіраліся прыняць ўдзел у Парыжскай мірнай канферэнцыі, на якой ён абмяркоўваўся. У якасці альтэрнатывы “плану Маршала” СССР прапанаваў сваім саюзнікам супрацоўніцтва ў рамках Савета Эканамічнай Узаемадапамогі. Заключыў двухбаковыя дагаворы са сваімі саюзнікамі аб эканамічным, палітычным і ваенным супрацоўніцтве. Тым самым ЦПУЕ замацоўвалася ў савецкай сферы ўплыву. Заходнія дзяржавы падпісалі 17 сакавік 1948 г. Брусельскі пакт, згодна якому утвараўся Заходні саюз у складзе Вялікабрытаніі, Францыі, Бельгіі, Нідэрландаў, Люсембурга.

Усё нарастаўшае супрацьстаянне паміж СССР і яго саюзнікамі і краінамі Захаду на чале з ЗША атрымала ў гісторыі назву “халодная вайна”. “Халодная вайна” – гэта глабальнае вострае ваенна-палітычнае, эканамічнае і ідэалагічнае проціборства дзвюх сістэм – капіталістычнай і сацыялістычнай. Яна вылілася ў барацьбу паміж звышдзяржавамі за сферы ўплыву ў розных раёнах свету. Часам гэтае супрацьстаянне адбывалася ў выглядзе лакальных войн. “Халодная вайна” ўключала гонку ўзбраенняў, псіхалагічную вайну ў форме прапаганды, падтрымку апазіцыйных сіл у стане праціўніка. Важнейшае месца ў супрацьстаянні СССР і ЗША належала эканамічнаму спаборніцтву. Адным з элементаў ваенна-палітычна ўздзеяння на праціўніка стала стварэнне ваенна-палітычных блокаў, якія згодна Статуту ААН маглі стварацца ў адпаведнасці з рэгіянальным прынцыпам.

Храналагічныя рамкі “халоднай вайны” – 1946–1991 гг. Этапы: 1) 1946–1969 гг. (1946–1954 гг. вызначаліся асаблівай напружанасцю ў міжнародных адносінах); 2) 1970–1979 гг. (“разрадка”); 3) 1980–1991 гг. (новае абвастрэнне міжнародных адносін.)

Пачатку “халоднай вайны” спрыяў клімат недаверу паміж краінамі і народамі. Пасля Другой сусветнай вайны СССР стаў ваеннай супердзяржавай, якая дамінавала ў Еўропе. Амерыканскія ваенныя лічылі, што для савецкіх войск не стане праблемай выйсці на берагі Ла-Манша. У

выніку Другой сусветнай вайны значна ўзмацніліся камуністычныя партыі і іншыя сацыяльна-палітычныя сілы, якія выступалі на баку СССР. Савецкае кіраўніцтва актыўна падтрымлівала камуністычныя партыі, у тым ліку і ў ваенным плане, як ў Грэцыі. На Захадзе з'явіліся апасенні, што свет сутыкнецца з шырокім наступленнем камунізму. Падзеі ў Іране, Турцыі, Грэцыі, краінах ЦПУЕ давалі падставы для такіх апасенняў.

З другога боку, у выніку Другой сусветнай вайны большасць дзяржаў свету апынуліся ў фінансава-эканамічнай залежнасці ад ЗША. Гэта давала ім магчымасць моцна ўплываць на сусветныя працэсы. Вялікі быў маральны аўтарытэт ЗША як краіны, якая не толькі перамагла нацызм, але і рэалізавала ў вайне дэмакратычныя мэты. Поспехі ЗША ў розных сферах умацоўвалі пазіцыі тых колаў гэтай краіны, якія выступалі з ідэяй аб месіянскай ролі ЗША ў свеце. Яны лічылі, што амерыканская мадэль грамадскага развіцця з'яўляецца найлепшай, і ЗША павінны актыўна распаўсюджваць яе на іншыя краіны. Пасля Другой сусветнай вайны гэтыя планы былі падмацаваныя і адпаведным ваенным, эканамічным, фінасавым патэнцыяламі. ЗША гатовы былі аказаць дапамогу іншым краінам у пасляваенным аднаўленні эканомікі, укласці свае капіталы. Але ім патрэбны былі гарантыі, што гэтыя краіны будуць развівацца ў рамках амерыканскай эканамічнай мадэлі, што інтарэсам інвестараў не будзе пагражаць ні палітычная нестабільнасць, ні нацыяналізацыя. Пакуль існавала пагроза распаўсюджвання камунізму на новыя краіны, такіх гарантый не было. Таму антыкамунізм становіцца краевугольным каменем амерыканскай знешняй палітыкі. Але пры гэтым адзначым, што абодва бакі не хацелі вайны. Перабольшвалі агрэсіўныя намеры адзін аднаго.

**3.** Сістэма міжнародных адносін, якая сфарміравалася пасля Другой сусветнай вайны, атрымала назву Ялцінская. Яе важнейшая прыкмета – біпалярная пабудова свету. Як ужо адзначалася СССР і ЗША па выніках Другой сусветнай вайны атрымалі статус звышдзяржаў. Яны сталі палюсамі пры фарміраванні біпалярнай сістэмы. Звышдзяржаўнасць СССР і ЗША грунтавалася на пэўных ідэалагічных устаноўках. У палітычных элітах дзвюх краін умацавалася перакананне ў непарыўнам адзінтве лёсаў усіх народаў свету. "Воля народаў" ставілася вышэй дзяржаўнага суверэнітэту. Рухавіком гістарычнага прагрэсу лічалася стварэнне для чалавека магчымасцей на рэалізацыю сваіх свяшчэнных праў. У амерыканскім варыянце – на асабістую свабоду, незалежнасць, у савецкім – на працу, справядлівасць. Адмова кого б то не было прызнаць гэтыя "сапраўдныя інтарэсы чалавека", якія аб'ядноўваюць людзей незалежна ад нацыянальнасці, веравызнання, разглядалася як выклік усяму чалавецтву, рэкцыйнае супраціўленне гістарычнаму прагрэсу. Любая дзяржава, якая спрабавала не толькі ў сусветным маштабе, але і ва ўласных граніцах супрацьпаставіць свой праект развіцця таму, што ў ЗША, ці ў СССР лічылася адзіным правільным варыянтам развіцця, разглядалася як антынародны рэжым. Калі шлях развіцця якой-небудзь краіны пярэчыў амерыканскім уяўленням аб

правільным шляху развіцця, то пра антынародны характар яе рэжыму гаварылі ў Вашынгтоне. Калі пярэчыў савецкім уяўленням аб правільным шляху развіцця – то ўжо Масква аб'яўляла такі рэжым антынародным.

Фактычна СССР і ЗША заявілі аб здольнасці ўзяць на сябе адказнасць за лёс чалавецтва і забяспечыць іншым народам магчымасць стаць на шлях прагрэсіўнага развіцця. У палітычных эліт звышдзяржаў склалася перакананне ў сваёй выключнасці, у тым, што іх свяшчэнны доўг і права заключаюцца ў тым, каб абараніць прагрэсіўнае будучае чалавецтва. Гэтыя асаблівасці звышдзяржаўнага мыслення і вызначалі непрымірымую варожасць паміж СССР і ЗША. Ва ўмовах гэтай варожасці кожная з звышдзяржаў імкнулася прыцягнуць да сябе максімальную колькасць не проста саюзнікаў, а сацелітаў, сфарміраваць свой лагер, які будзе здольны эфектыўна супрацьстаяць варожаму лагеру, адстойваючы адзіна правільны шлях развіцця для ўсяго чалавецтва. Гэта і абумовіла, што вакол кожнага з палюсоў сілы, СССР і ЗША, сталі фарміравацца супрацьстаячыя лагеры. Выступаючы 12 сакавіка 1947 г. Г. Трумэн заявіў аб наяўнасці ў свеце двух шляхоў развіцця і двух супрацьлеглых блокаў.

Пасля таго, як у СССР з'явілася ядзерная зброя і сродкі, здольныя даставіць ядзерныя зарады на тэрыторыю ЗША, рэальнасцю стала пагроза ўзаемнага знішчэння звышдзяржаў у ядзернай вайне, гібелі ўсяго чалавецтва ў ёй. Такім чынам у свеце склалася "раўнавага страху" з-за магчымай гібелі ў ядзернай вайне. Гэта стала бар'ерам для развязвання сусветнай вайны, у якой звышдзяржавы сутыкнуліся б непасрэдна. Такім чынам забяспечвалася адносная стабільнасць двухпалярнага свету. Еўропа была цэнтрам супрацьстаяння двух лагераў, але стабільнасць заснаваная на страху дазволіла ёй пазбегнуць вайны. У той жа час у "трэцім свеце", на былой каланіяльнай перыферыі два палюсы вялі пастаянную барацьбу, каб прыцягнуць да сябе новых сацелітаў. Гэта параджала лакальныя войны і канфлікты. Але і ў іх звышдзяржавы імкнуліся не даводзіць справу да прамога сутыкнення. З улікам супрацьстаяння ў самых розных сферах, наяўнасці лакальных канфліктаў, гонкі ўзбраенняў стабільнасць біпалярнага свету была вельмі неўстойлівай.

Фарміраванне двухпалярнага свету сімвалізавала стварэнне пад эгідай звышдзяржаў ваенна-палітычных блокаў. Ужо ў 1947 г. па ініцыятыве ЗША ўсе амерыканскія дзяржавы за выключэннем Канады падпісалі Міжамерыканскі дагавор аб ўзаемадапамозе. Ён прадугледжваў сумесныя дзеянні амерыканскіх дзяржаў у выпадку нападзення на адну з іх, а таксама ў любой сітуацыі, якая можа пагражаць міру. Такая шырокая фармулёўка дазваляла ЗША ўмешвацца ва ўнутраныя справы амерыканскіх дяржаў. На аснове дагавора ў 1948 г. была створана Арганізацыя амерыканскіх дзяржаў, што канчаткова афарміла саюз амерыканскіх дзяржаў на чале з ЗША.

У Еўропе першым ваенна-палітычным блокам стаў Заходні саюз, створаны ў адпаведнасці з Брусельскім пагадненнем 1948 г. Вялікабрытаніяй, Францыяй, Бельгіяй, Нідэрландамі і Люксембургам. Члены саюза абавязаліся

аказваць дапамогу адзін аднаму ў выпадку агрэсіі ў Еўропе. Саюз быў цесна звязаны з ЗША.

4 красавіка 1949 г. у Вашынгтоне ЗША, Канада і 10 краін Заходняй Европы падпісалі Паўночна-Атлантычны пакт. Згодна з ім была створана Арганізацыя Паўночна-Атлантычнага дагавора (НАТО). Удзельнікі НАТО абавязаліся аказваць ўзаемную дапамогу ў выпадку агрэсіі супраць іх у рэгіёне Еўропы і Паўночнай Амерыкі. Паўночна-Атлантычны пакт дапускае ўмяшэнне ў унутраныя справу ўдзельнікаў, калі ўзнікае пагроза іх бяспецы, тэрытарыяльнай цэласнасці, незалежнасці. У рамках НАТО былі створаны аб’яднаныя ўзброеныя сілы пад камандаваннем амерыканскага генерала.

Стварэнне ваенна-палітычных блокаў адбывалася ў Азіі і Акіяніі. У 1951 г. ЗША падпісалі дагавор бяспекі з Японіяй. Ён дазваляў ЗША трымаць свае ўзброеныя сілы на тэрыторыі Японіі. У 1951 г. ЗША падпісалі дагавор бяспекі таксама з Аўстраліяй і Новай Зеландыяй (АНЗЮС). У 1954 г. быў утвораны блок Арганіязацыя дагавора для Паўднёва-Усходняй Азіі (СЕАТО). У СЕАТО ўвайшлі ЗША, Вялікабрытанія, Францыя, Аўстралія, Новая Зеландыя, Пакістан, Таіланд, Філіпіны. Ён прадугледжваў узаемадапамогу не толькі ў выпадку знешняй агрэсіі, але і ўнутранай небяспекі. У 1955 г. быў падпісаны Багдадскі пакт (затым СЕНТО), які стварыў ваенны блок у складзе Вялікабрытаніі, Турцыі, Ірака, Ірана, Пакістана.

Адначасова фарміраваўся савецкі блок. СССР заключыў дагавор аб дружбе супрацоўніцтве і ўзаемадапамозе з Фінляндыяй, але пры гэтым Фінляндыя захавала нейтральны статус і капіталістычны шлях развіцця. З Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікай СССР падпісаў дагавор аб эканамічным і культурным супрацоўніцтве. З Кітайскай Народнай Рэспублікай – аб дружбе, саюзе і ўзаемадапамозе. У 1955 г. у адказ на ўступленне ў НАТО ФРГ СССР, Польшча, Чэхаславакія, ГДР, Венгрыя, Румынія, Балгарыя, Албанія падпісалі Варшаўскі дагавор аб узаемадапамозе. Была створана Арганізацыя Варшаўскага дагавора (АВД).

Біпалярная сістэма праявіла сябе пры вырашэнні германскага пытання. Кожны з палюсоў не хацеў дапусціць, каб Германія далучылася да супрацьлеглага лагера. Вынікам гэтага стаў раскол Германіі і далучэнне ГДР да савецкага лагера, а ФРГ – да амерыканскага.

У ўмовах біпалярнага свету засталіся краіны, якія спрабавалі застацца за межамі ўзнікшых ваенна-палітычных блокаў. У красавіку 1955 г. у г. Бандунг (Інданезія) адбылася канферэнцыя 29 краін, якая прыняла выніковыя дакументы, у якіх адстойвалася ідэя мірнага суіснавання на аснове Статута ААН, заяўлялася пра адмову ад удзелу ў пагадненнях аб калектыўнай абароне. Гэтая канферэнцыя паклала пачатак фарміраванню Руху недалучэння. У верасні 1961 г. на канферэнцыі ў Белградзе прадстаўнікі 25 краін абвясцілі стварэнне Руху недалучэння. У аснову рашэнняў канферэнцыі былі пакладзены прынцыпы падтрымкі антыкаланіяльнага руху, правядзенне знешняй палітыкі ў духу мірнага суіснавання, недалучэнне да ваенных блокаў, якія стварыліся вялікімі дзяржавамі. Заснавальнікамі Руху недалучэння выступілі Іосіп Броз Ціта, Гамаль Насер, Джавахарлал Неру. Па

меры дэкаланізацыі колькасць удзельнікаў Руху недалучэння хутка павялічвалася.

**4.** “Халодная вайна” характарызавалася вострым супрацьстаяннем паміж двума лагерамі, тымі ваенна-палітычнымі блокамі, якія склаліся ў свеце. Гэтае супрацьстаянне праяўлялася і ў выглядзе міжнароднапалітычных крызісаў і лакальных войн і канфліктаў. Адным з першых у ліку міжнародных крызісаў часоў “халоднай вайны” стаў Берлінскі крызіс 1948–1949 гг. 24 чэрвеня 1948 г. савецкія войскі ўстанавілі блакаду Заходняга Берліна. Падставай стала правядзенне ў заходніх зонах акупацыі сепаратнай грашовай рэформы. Стратэгічная мэта СССР заключалася ў тым, каб прымусіць заходнія дзяржавы пакінуць свае зоны акупацыі ў Берліне. Узнікла пагроза ваеннага сутыкнення паміж нядаўнімі саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі. Дзякуючы “паветранаму мосту” Заходні Берлін вытрымаў савецкую блакаду. У маі 1949 г. яна была знята.

Два лагеры сутыкнуліся ў ваенным супрацьстаянні ў Карэйскай вайне 1950–1953 гг. Пры падтрымцы Кітайскай Народнай Рэспублікі і з адабрэння СССР лідар КНДР Кім Ір Сен пачаў 25 ліпеня 1950 г. вайну супраць Карэйскай Рэспублікі, каб аб’яднаць усю Карэю пад уладай камуністаў. Па ініцыятыве ЗША Савет Бяспекі ААН у ўмовах, калі СССР байкатаваў яго работу, прыняў рэзалюцыю па карэйскаму пытанню. Рэзалюцыя абвяшчала Паўночную Карэю агрэсарам, на дапамогу Паўднёвай Карэі як ахвяры агрэсіі накіроўваліся войскі ААН. Свае кантынгенты выставілі 15 дзяржаў, але аснову міжнародных сіл складалі амерыканскія войскі (50 % сухапутных сіл, 93 % ВПС, 86 % ВМС). Калі восенню 1950 г. войскі ААН занялі большую частку тэрыторыі КНДР, на баку апошняй у вайну ўступілі савецкія ВПС і армія КНР. Камандуючы амерыканскімі войскамі генерал Макартур, каб дабіцца пералома ў вайне, паставіў пытанне аб выкарыстанні атамнай зброі. Аднак прэзідэнт Трумэн хацеў пазбегнуць разрастання канфлікта і Макартура не падтрымаў. Вайна ў Карэі закончылася падпісаннем перамір’я 27 ліпеня 1953 г. Лінія размежавання прайшла прыкладна па той самай 38 паралелі, з якой вайна пачыналася.

Вострай заставалася германская праблема. Падыходы да пытання аб аб’яднанні Германіі і мірным дагаворы з ёй у СССР і заходніх дзяржаў заставаліся супрацьлеглымі. Заходнія краіны бачылі шлях да аб’яднання Германіі праз правядзенне агульнагерманскіх свабодных выбараў. СССР прапаноўваў вырашэнне гэтага пытання праз перамовы дзвюх германскіх дзяржаў. Фактычна гэта была спроба легалізаваць існаванне ГДР як суверэннай дзяржавы. Урад Адэнауэра не прызнаваў ГДР і адмаўляўся весці з ёй перамовы. У 1959 г. СССР прапанаваў заключыць мірны дагавор ці аднгачасова з дзвюма германскімі дзяржавамі, ці з Германскай канфедэрацыяй, калі ўдасцца яе стварыць. Перамовы СССР з заходнімі дзяржавамі па гэтаму пытанню, якія адбываліся ў Жэневе летам 1959 г., не далі вынікаў

У 1958 г. урад ГДР заявіў аб сваіх прэтэнзіях на суверэнітэт над Заходнім Берлінам. СССР прапаноўваў ператварыць Заходні Берлін у нейтральны дэмілітарызаваны вольны горад. У адказ на патрабаванне краін АВД аб нейтралізацыі і дэмілітарызацыі Заходняга Берліна краіны НАТО ў маі 1961 г. заявілі аб намеры пакінуць свае войскі ў Заходнім Берліне. Сіутацыя вакол Заходняга Берліна ўскладнялася тым, что праз яго, выкарыстоўваючы адсутнасць пагранічнага кантролю, жыхары ГДР масава пераязджалі ў ФРГ (за першую палову 1961 г. – 200 тыс. ). На нарадзе прадстаўнікоў правячых камуністычных партый краін АВД у Маскве 3–5 жніўня 1961 г. было прынята рашэнне аб закрыцці граніцы паміж ГДР і Заходнім Берлінам. 13 жніўня пачалося будаўніцтва Берлінскай сцяны. Пры гэтым уздоўж лініі размежвання паміж ГДР і Заходнім Берлінам былі разгорнуты савецкія войскі і войскі заходніх дзяржаў. Аднак ваеннага сутыкнення ўдалося пазбегнуць.

Бліжэй за ўсё ва ўмовах “халоднай вайны” чалавецтва наблізілася да сусветнай ядзернай вайны ў час Карыбскага крызісу ў другой палове кастрычніка 1962 г. У яго рамках супрацьстаянне выйшла за рэгіянальны ўзровень і набыло глабальны характар. У яго непасрэдна былі ўцягнутыя звышдзяржавы. Н. Хрушчоў вырашыў скарыстаць геапалітычнае становішча Кубы, каб стварыць для ЗША пагрозу ядзернага ўдара з яе тэрыторыі. Калі амерыканскія ваенныя ўстанавілі факт знаходжання савецкай яедзернай зброі на Кубе, прэзідэнт Кенэдзі запатрабаваў яе неадкладнага вываду і абвясціў ваенна-марскую блакаду Кубы. Стала рэальнай магчымасць нанясення амерыканцамі ўдара па савецкіх ваенных аб’ектах на Кубе. Амерыканскія войскі ў усім свеце былі прыведзены ў баявую гатоўнасць. Аднак Хрушчоў і Кенэдзі змаглі прыйсці да пагаднення. СССР выводзіў сваю ядзерную зброю з Кубы. ЗША выводзілі ядзерныя ракеты з Турцыі і давалі гарантыі ненападзення на Кубу.

З 1964 г. пачалося ў актыўнае ўмяшанне ЗША ў вайну ў В’етнаме. Яно было выклікана імкненнем амерыканскага ўрада не дапусціць распаўсюджвання камунізму на Паўднёвы В’етнам. Паколькі камуністычны партызанскі рух у Паўднёвым В’етнаме разгортваўся дзякуючы вялікай дапамозе, якая ішла з Дэмакрнатычнай Рэспублікі В’етнам (ДРВ), то ЗША не толькі накіравалі свае войскі для барацьбы з партызанамі ў Паўднёвым В’етнаме, але і пачалі бамбардзіроўкі Паўночнага В’етнама. Дабіцца ваеннай перамогі ЗША не змаглі і ўжо ў 1968 г. заявілі аб гатоўнасці пачаць перамовы. Яны праходзілі ў Парыжы з 1969 па 1973 г. Падпісаныя па іх выніках пагадненні прадугледжвалі вывад амерыканскіх войск і мірнае аб’яднанне В’етнама шляхам правядзення ўсеагульных выбараў. Аднак пасля вываду амерыканскіх войск вясной 1975 г. партызаны Поўдня і рэгулярная армія ДРВ пачалі генеральнае наступленне і ліквідавалі паўднёвав’етнамскі рэжым. Такім чынам, спроба ЗША спыніць распаўсюджванне камунізму ў Індакітаі ваенным шляхам закончылася поўнай няўдачай. Камуністы ўсталявалі кантроль не толькі над усім В’етнамам, але і над Лаосам і Камбоджай.

На Блізкім Усходзе супрацьстаянне паміж двума лагерамі знайшло адлюстраваннеў у араба-ізраільскім канфлікце. Арабскія краіны не прызналі рэзалюцыю ААН 1947 г. аб стварэнні ў Палесціне дзвюх дзяржаў: арабскай і яўрэйскай. Спроба арабаў "скінуць Ізраіль у Міжземнае мора" ў час вайны 1948–1949 гг. закончылася няўдачай. Пры гэтым так і не была створана арабская палесцінская дзяржава. У першай араба-ізраільскай вайне СССР і ЗША разам падтрымалі Ізраіль. Затым сітуацыя мяняецца. У час Шасцідзённай вайны ў чэрвені 1967 г. ЗША падтрымлівалі Ізраіль, а СССР – арабскія краіны. Шасцідзённай вайна фактычна была прэвентыўным ударам Ізраіля па арабскіх краінах ва ўмовах, калі Егіпет і Сірыя рыхтавалі напад на яго. Вайна закончылася буйгной ваеннай перамогай Ізраіля. Ён акупіраваў Сектар Газа, Сінайскі п-аў, Галанскія вышыні, Усходні Іерусалім, Заходні Бераг ракі Іардан. СССР і іншыя сацыялістычныя краіны абвінавацілі Ізраіль у агрэсіі і разарвалі з ім дыпламатычныя адносіны.

22 лістапада 1967 г. Савет Бяспекі ААН прыняў рэзалюцыю, якая патрабавала вываду арабскіх войск з тэрыторый, якія ён акупіраваў у выніку Шасцідзённай вайны. Ізраіль адмовіўся яе выканаць, спасылаючыся на тое, што арабскія краіны не прызнаюць яго права на існаванне. Спроба арабаў у кастрычніку 1973 г. пад час Вайны суднага дня узяць рэванш за папярэднія паражэнні закончылася няўдачай. Ваенныя дзеянні былі спыняны па патрабаванні рэзалюцыі Савета Бяспекі ААН, якая была вынікам сумеснай ініцыятывы СССР і ЗША.